# АД ПАЛЕСКІХ АФІН ДА БЕЛАРУСКІХ МАЛЬДЫВАЎ



## У МАНАСТЫР НА ГАРБАТУ

Мяркуеце, гэта не зусім на адрас? На думку Ірыны Радзецкай, у яе палескіх Афінах абсалютна нармальна спалучыць паломніцтва ў манастыр з атрыманнем асалоды ад свежай выпечкі і ўдзелу ў трапезе.

Ірына працуе настаўніцай гісторыі ў Слонімскай сярэдняй школе № 2 і мае пасведчанне экскурсавода. Можна ўявіць, колькі ўсяго цікавага ведае яна пра свой край. У тым ліку пра мясціны, якія не вельмі вядомыя. Ірына прапанавала новы экскурсійны маршрут пад назвай «Усе госці — у край палескіх Афін». З гэтым праектам яна перамагла ў намінацыі «Найлепшы тур выхаднога дня». Галоўная ўвага ў маршруце дадаецца духоўнай спадчыне.

Прапануе Ірына спачатку завітаць у слонімскі Свята-Благавешчанскі жаночы манастыр і наведаць іканапісную майстэрню. Пры напісанні абразоў тут выкарыстоўваюць толькі прыродныя матэрыялы, а іконы ўпрыгожваюць і сам манастыр, і Жыровіцкі манастырскі комплекс. Таксама тут пішуць іконы на заказ.

Манастыр мае падворак у вёсцы Парэчча Слонімскага раёна. Тут аднаўляецца храм святога Георгія Перамаганосца. Многім падворак запомніцца смачным хлебам і булачкамі, якія выпякаюць па старажытным рэцэпце. Усё гэта можна купіць, а таксама пакаштаваць манастырскай гарбаты і іншых страў.

Далей духоўны маршрут вядзе ў вёску Шылавічы, на ўскрайку якой знаходзіцца каменны крыж. Кажуць, што ён расце проста з зямлі, але каб упэўніцца ў гэтым, трэба наведаць Шылавічы некалькі разоў.

Можна завітаць у вёску Русакова, дзе размясціўся жаночы манастыр у гонар прападобнага Амвросія Опцінскага. Дарэчы, манахі Опцінай пустыні — знакамітага манастыра ў Калужскай вобласці Расійскай Федэрацыі — дапамагаюць беларускім манашкам. Насельніцы Свята-Амвросіеўскага манастыра, сярод іншага, вырошчваюць і нарыхтоўваюць лекавыя расліны, прафесійна складаюць з іх зборы. Тут можна атрымаць кансультацыю і зрабіць пакупку.

Яшчэ адзін пункт маршрута — Свята-Зосіма-Савацііеўскі мужчынскі манастыр у вёсцы Вялікая Кракотка. Непадалёку ад яго, больш за сотню гадоў з пяску прабіваецца гаючая крыніца, якую асвяцілі ў гонар Іаана Хрысціцеля. Ваду можна набраць, каб забраць з сабой. Дарэчы, у такія падарожжы варта браць адпаведныя ёмістасці.

У самім манастыры працуюць сталярныя майстэрні, дзе вырабляюць царкоўную мэблю, ёсць пчальнік, тут можна набыць мёд і духмяныя «кракоцкія» свечкі. Па словах Ірыны, калі дамовіцца пра прыезд, турыстаў сустракае і частуе гарбатай з мёдам сам ігумен Міхей (Бараноўскі).

І гэта далёка не поўны маршрут, а толькі яго частка. Другі выхадны дзень Ірына прапануе прысвяціць Слоніму, дзе знаходзіцца нямала культавых гістарычных будынкаў, у тым ліку мячэць і сінагога.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



## «МАЛЬДЫВЫ» І СТАРАЖЫТНЫЯ ШАХЦЁРЫ

Гаворка пра прамысловы турызм. Дадзены кірунак пакуль не такі «раскручаны», як гістарычны ці экалагічны. У аддзеле спорту і турызму Ваўкавыскага райвыканкама задумалі спалучыць у адным маршруце вытворчасць і прыгожы ландшафт. Так нарадзіўся праект «Па слядах старажытных шахцёраў», які знаёміць з вытворчасцю цэменту і Краснасельскімі крэйдавымі кар'ерамі. Маршрут стаў пераможцам конкурсу ў сваёй намінацыі.

Па словах **начальніка аддзела Наталлі ЧУМАКОВАЙ**, на цэментным заводзе гатовыя падключыцца да праекта. На прадпрыемстве, якому больш за сто гадоў, ужо ёсць свой маршрут. Тут могуць правесці па заводзе, пазнаёміць з тэхналогіяй вытворчасці



цэменту, цэнтральным пунктам кіравання, музеем. Захаваліся шахты, дзе здабывалі крэмній першабытныя людзі. Аб старажытнай стаянцы сведчыць многае, у тым ліку і экспанаты музея.

Дарэчы, тут можна ўбачыць крэйдавыя адбіткі дагістарычных марскіх насельнікаў — двухстворкавага малюска, пектуса, марскіх вожыкаў, ракавін галаваногіх малюскаў аманітаў. А самаму старажытнаму — адбітку рыбы віду Хоплаптэрыкс — больш за 60 мільёнаў гадоў. Знайшлі гэты адбітак у 2004 годзе падчас работы на крэйдавым кар'еры. Можна разгледзець луску, плаўнікі і вачніцы рыбы. Сапраўднасць віду была ўстаноўлена навукоўцамі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Працэс выпуску цэменту звязаны са здабычай вапны. Пасля таго як кар'ер вычарпаў свой рэсурс, тэхніку пераводзяць на новыя распрацоўкі, а стары кар'ер запаўняецца вадой. У сувязі з тым, што на дне знаходзіцца крэйда, вада набывае бірузовы колер. Так з'явіліся вядомыя крэйдавыя кар'еры, якія ў народзе атрымалі назву «беларускія Мальдывы». Гэта зона заўсёды вабіла экстрэмалаў і аматараў фотасесій, хоць і была забаронена для наведвальнікаў. Але нядаўна на схіле распрацаванай дзесяць гадоў таму лінзы цэментным заводам абсталявана аглядальная пляцоўка. Цяпер рабіць фота на фоне стометровага кар'ера стала бяспечна. Пляцоўка добра замацавана, забетаніравана і агароджана. У іншым выпадку кар'еры нясуць пагрозу аматарам экзотыкі. Крэйда, якая стварае блакітна-смарагдавы колер вады, — парода няўстойлівая, берагі кар'ера схільныя да эрозіі, пра што папярэджваюць аўтары праекта. Маршрут працягласцю 45 кіламетраў разлічаны на шэсць гадзін незабыўных уражанняў.

Дарэчы, ёсць цікавы факт. У 1940 годзе на цэментным заводзе праходзіў пераддыпломную практыку будучы народны пісьменнік Беларусі Іван Шамякін, які заканчваў вучобу ў Гомельскім тэхнікуме будматэрыялаў. Праз гады ў лісце супрацоўнікам завода пісьменнік напіша: «Але, як бачыце, цэментніка з мяне не атрымалася. Захапіла літаратура...»

## ШТО ЧУЕ «ЛЯСНОЕ ВУХА»

У конкурсе на найлепшы экалагічны маршрут перамог Лідскі лягас з праектам «Парк "Горні" — жамчужына Лідскай зямлі».

Парк каля Ліды быў закладзены 140 гадоў таму і з'яўляецца помнікам прыроды мясцовага значэння. Закладвалі яго па ініцыятыве царскай дзяржаўнай ляснай аховы. З той пары захаваліся ліпавыя алеі, асобныя насаджэнні лістоўніцы сібірскай, сасны Веймутава і звычайнай, дуба і ясеня. З рэдкіх можна назваць клён Гінала, вязы, грабы, чырвоны дуб, ніцую бярозу, белую таполю — усяго больш за 40 відаў дрэў і кустоў.

Тут растуць некалькі сотняў дрэў, чый узрост перайшоў стагодовы рубеж альбо набліжаецца да яго. Захаваць старыя дрэвы дапамагаюць сучасныя тэхналогіі. Самы старажытны насельнік — цукрысты клён. Ён яшчэ і самы магутны. Яго вышыня — больш за 30 метраў, а дыяметр больш за чатыры метры. У лягасе былі заклапочаны яго станам, бо дрэва развальвалася, адпала вялікая галіна. Але дзякуючы прынятым мерам клён працягвае свой век. Тут можна сфатаграфавацца побач з «Лясным духам». А «Ляснаму вуху» шэптам расказаць пра свае жаданні. Гэтых герояў стварыў мясцовы майстар у рамках міжнароднага праекта. Вынікам праекта таксама стала арганізацыя на тэрыторыі парка Экалагічнага адукацыйнага цэнтра. Ёсць тут і невялікая турыстычная база, дзе можна застацца на некалькі дзён.

Нядаўна ў парку з'явілася новая алея, якая вядзе да воінскага абеліска. Помнік Невядомаму салдату ўстаноўлены ў 60-х гадах мінулага стагоддзя. Месца расчысцілі, помнік аднавілі. Свае сямейныя дрэвы садзяць тут шлюбныя пары. Дарэчы, у парку можна ўбачыць цесна сплеценыя чарэшчаты дуб і ліпу, кроны якіх губляюцца ў вышыні. Аўтары праекта кажуць, што дрэвы спляліся, каб разам свой век дажываць і адно аднаго падпіраць.

**Надзея СЦЯПУРА, намеснік старшыні Гродзенскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў:**

— У конкурсе на найлепшы новы турыстычны маршрут узялі ўдзел усе раёны Гродзеншчыны. Было даслана некалькі дзясяткаў заявак. Мы ўбачылі, колькі яшчэ новых, малавядомых, цікавых мясцін тоіць у сабе глыбінка. Галоўным крытэрыем была навізна. Але не толькі. Улічвалася і тое, ці маршрут будзе працаваць, наколькі цікавыя аб'екты ён прапануе, як і хто пра іх зможа расказаць. Турыстам мала толькі бачыць прыгожы будынак ці прайсціся па старым парку, іх цікавяць падзеі і людзі, тайны, легенды. Маршруты-пераможцы будуць асвойвацца нашым турыстычным бюро падарожжаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Каля 2,8 мільёна чалавек у Францыі ўзялі ўдзел у пратэстах супраць пенсіённай рэформы



Пра гэта паведамляюць французскія СМІ са спасылкай на прафсаюз «Усеагульная канфедэрацыя працы» (CGT). Прычым у МУС Францыі ацанілі колькасць удзельнікаў — 1,2 млн чалавек. Французскія СМІ зазначаюць, што ў цэлым гэтым разам удзельнікаў акцый было больш, чым падчас першых маніфестацый 19 студзеня. Тады ўлады Францыі заяўлялі, што ў акцыях удзельнічаў 1 млн чалавек, а прафсаюзы, што 2 млн. Раней паведамлялася, што, паводле звестак CGT, у Парыжы на вуліцы выйшла паўмільёна. У сваю чаргу, у паліцыі французскай сталіцы адзначалі, што на дэманстрацыі сабралася менш чым 100 тысяч чалавек. Прафсаюзы заклікалі пратэстоўцаў выйсці на новыя акцыі 7 і 11 лютага.

### Кіраўніком урада Экватарыяльнай Гвінеі ўпершыню ў гісторыі краіны стала жанчына



Прэзідэнт Экватарыяльнай Гвінеі Тэадора Абіянг Нгема Мбасога сваім указам прызначыў на пасаду прэм'ер-міністра краіны Мануэлу Рока Бацэй. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на паўднёваафрыканскую радыёстанцыю SABC. З 2016 года пасаду прэм'ера займаў Франсіска Паскуаль Абама-Асуе. Новы прэм'ер мае досвед работы ва ўрадзе, са жніўня 2020 года яна была міністрам-дэлегатам у міністэрстве адукацыі. Апошняя пасада Мануэлы Рока Бацэй — намеснік дэкана факультэта літаратуры і сацыяльных навук Нацыянальнага ўніверсітэта Экватарыяльнай Гвінеі.

### Даходы Турцыі ад турызму перавысілі рэкордныя $46 млрд



Турцыя ўстанавіла новы рэкорд па даходах ад турыстычнай галіны — звыш $46,2 млрд па выніках 2022 года, гэта на 53,4 працэнта больш, чым годам раней. Аб гэтым паведаміла газета Hurriyet са спасылкай на даныя Інстытута статыстыкі Турцыі (TUIK). Летась Турцыю наведала больш чым 44 мільёны замежных турыстаў. Іх асабістыя расходы склалі $34,4 млрд, а траты ў рамках турпакетаў — звыш $11,8 млрд, піша выданне. Як адзначыў міністр культуры і турызму краіны Мехмет Нуры Эрсай, сёлета Турцыя плануе прыняць 60 млн турыстаў і атрымаць даход у памеры $56 млрд. У 2028 годзе краіна прагназуе рост турпатоку да 90 млн чалавек, а даходаў ад турызму — да $100 млрд.